

**КАВАЛЕВІЧ Аляксей Пятровіч**
**(28.07.1929г.)**

Нарадзіўся ў вёсцы Мілявічы Мастоўскага раёна ў сям'і вясковага каваля. Закончыў Мілявіцкую пачатковую школу, затым Дзярэчынскую сярэднюю школу.

У 1950 годзе паступіў у Гродзенскі педінстытут імя Я. Купалы, які скончыў у 1954 годзе па спецыяльнасці выкладчык беларускай мовы і літаратуры. Выкладаў родную мову ў школах Воранаўскага раёна.

У 1963 годзе пераехаў у г. Міёры Віцебскай вобласці, дзе працаваў выкладчыкам роднай мовы ў Міёрскай сярэдняй школе, інспектарам раена. З 1969 года і да выхаду на пенсію намеснікам рэдактара Міёрскай райгазеты "Сцяг працы".

У 1995 годзе выйшаў з друку яго першы зборнік вершаў "Прыстанак", у 1996 г. кніга нарысаў і замалёвак "Сустрэча праз гады", у 1997 г. паэтычны зборнік "Прыгоды Дзеда Мароза і Снягурачкі на Міёршчыне", у 1998 г.кніга нарысаў і замалёвак "Бацькоўскія карані", у 2000 г. кніга "Волат на пустэчы", у 2002 г. зборнік нарысаў, замалёвак і вершаў "Ах, мая Рэдакцыя! ".

**Бібліяграфія**

1. **Аляксей Кавалевіч //** Зоры над Зальвянкай: зборнік вершаў / Літ. аб'яд-не "Зоры над Зальвянкай". — Слонім: Слонімская друкарня, 2008. — С. 40—44.
2. **Аляксей Кавалевіч — настаўнік, журналіст, паэт і празаік** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://mijory.by/litaraturnaya-staronka/10368-aleksey-kovalevich-uchitel-zhurnalist-poet-i-prozaik.html . - Дата обращения: 28.11.2022.
3. **Матэленак, Л. Няхай карэньчыкі мдуць глыбока-глыбока ў родную зямельку** / Леанід Матэленак // Праца. — 1999. — 24 ліпеня. — С. 4.
4. **ПІСЬМЕННІКІ, ПАЭТЫ, ЛІТАРАТАРЫ МІЁРСКІ РАЁН** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://www.miory-biblioteka.by/kraevedenie/miorchane/pismenniki-paety-litaratary . - Дата обращения: 28.11.2022.